

Францыск Скарына(1482=-1551 гг.)

# Біяграфія

Першапачатковую адукацыю Францыск Скарына набыў у Полацку, затым скончыў факультэт вольных мастацтваў (філасофскі факультэт) Кракаўскага універсітэта. Францыск Скарына двойчы стаў доктарам навук. Спачатку ѐн атрымаў у Кракаве ступень бакалаўра — першую вучоную ступень у сярэдневяковых еўрапейскіх універсітэтах. Затым у 1512 годзе паспяхова здаў экзамен на званне доктара медыцыны ў Падуанскім універсітэце. Яго партрэт, створаны ўжо ў сярэдзіне XX ст., знаходзіцца ў мемарыяльнай зале сярод 40 партрэтаў знакамітых еўрапейскіх навукоўцаў, што выйшлі са сцен Падуанскага ўніверсітэта. Скарына меў таксама ступень доктара вольных навук, якія вывучаліся ў заходнееўрапейскіх універсітэтах пад назвай «сем вольных навук»: граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка. На падобны факультэт вольных мастацтваў Кракаўскага універсітэта ў 14-гадовым узросце паступіў Сымон Будны.

# У Кракаве. Атрыманне ступені бакалаўра

У 1504//////-/1505 вучэбным годзе, калі Францыск стаў студэнтам, ва ўніверсітэт паступіла 291 чалавек, з іх 141 — з ураджэнцы Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, а 150 — з-за мяжы. З 291 абітурыентаў вучоную ступень атрымалі 60 юнакоў, у тым ліку і Скарына. Праз 2 гады (мінімальны час для студэнтаў філасофскага факультэта) у 1506 годзе ён вытрымаў экзамен на ступень бакалаўра вольных мастацтваў. Гэта адбылося 14 снежня 1506 года. З усіх студэнтаў Скарыны, атрымаўшых разам з ім ступень бакалаўра, захаваліся звесткі толькі пра Андрэя з Пакоста, які пасля застаўся пры ўніверсітэце, чытаў тут лекцыі, а пасля стаў гнезненскім вікарыем і пракуратарам.

# У Падуі. Допуск к экзаменам

Пазней за восень 1512 года Францыск Скарына прыбыў у Італію, у Падую, каб набыць ступень доктара медыцыны. У першым акце апавядаецца пра пасяджэнне калегіі дактароў вольных мастацтваў і медыцыны, якое адбылося ў царкве святога Урбана 5 лістапада 1512 года. Пасля ў залу запрасілі Скарыну. Затым калегія прыступіла да абмеркавання. Выступленні, паводле акта, былі шматлікімі. Канечна пытанне вырашалася галасаваннем, якое было аднагалосным — усе дактары выказаліся за тое, каб дапусціць Скарыну да экзаменаў.

# У Падуі. Экзамены

Уласна экзамен адбыўся 9 лістапада 1512 года ў палацы біскупа. Аднак, гэта была хутчэй загадзя падрыхтаваная парадная цырымонія, бо пытанне з прысваеннем ступені было вырашана яшчэ 6 лістапада. Сярод ганаровых гасцей былі біскуп Аргеліскі Паўла Забарэла, віцэ-рэктар універсітэта, доктар медыцыны і свабодных мастацтваў Францыска Фульманелі з Вероны, названы ў акце «*выдатным навукоўцам*». Скарыне ізноў прапанавалі пытанні па медыцыне. Паводле дакумента, «*пан магістр Францыск, сын нябожчыка пана Лукі Скарыны з Полацка, русін, на прапанаваныя яму раніцай гэтага дня пытанні па медыцыне бліскуча адказваў па памяці і адхіліў выказаныя яму пярэчанні, выдатна аргументуючы, ён праявіў сябе найлепшым чынам. У сувязі з гэтым усімі там прысутнымі вучонымі, з агульнай згоды ён быў ацэнены як падрыхтаваны і варты быць дапушчаным да асобага экзамену па медыцыне.*».

# Першая надрукаванная кніга

Кнігавыдавецкая дзейнасць Францыска Скарыны спалучала вопыт еўрапейскага кнігадрукавання і традыцыі беларускага мастацтва. 6 жніўня 1517 года Скарына першы сярод усходніх славян выдаў у чэшскім горадзе Празе (так як на роднай зямлі не было яшчэ неабходных умоў для пачатку друкарскай справы) друкаваную кнігу — Псалтыр. Ён зрабіў пераклад Псалтыра на мову, набліжаную да беларускай і зразумелую простаму люду — царкоўнаславянскую мову ў беларускай рэдакцыі.

# У Вільні

Каля 1520 года Францыск Скарына пераехаў у сталіцу Вялікага Княства Літоўскага Вільню. Выказваецца меркаванне, што прыезд Скарыны быў выкліканы падрыхтоўкай да друку толькі што прынятага Статуту, які вялікі князь абяцаў надрукаваць «вялікай колькасцю кніг бітымі літарамі». Друк так і не адбыўся, але мяркуецца, што шрыфт для выдання быў адліты, ён пазней выкарыстоўваўся для набору «Малой падарожнай кніжкі» і Апостала. У Вільні Скарына выконваў функцыі сакратара віленскага біскупа Яна з князёў літоўскіх. Удзельнічаў пры рэгістрацыі граматы на заснаванне касцёла ў мястэчку Вісіце.

# Паездка уў Маскву

Як лічаць даследчыкі у канцы 1520 — пачатку 1530-х гг. Скарына мог наведаць Маскву з мэтай распаўсюджання сваіх выданняў. Гэтыя меркаванні грунтуюцца на граце Жыгімонта Аўгуста 1552 года: «*… калі ў праўленне нашага богададзенага бацькі нейкі яго падданы, вядомы набожным намерам, вырашыўшы надрукаваць і выдаць на рускай мове Свяшчэннае Пісанне, прыбыў к маскавітам, гэтыя кнігі былі публічна спаленыя паводле загада князя, таму што былі выданы падданым рымскай царквы і ў месцах, якія падлягаюць яе ўладзе*». Версія лічыцца магчымай, у напружаных сацыяльна-палітычных абставінах у Маскоўскай дзяржаве, дзе былі памятныя ерасі з іх вольным тлумачэннем біблейскіх тэкстаў. У 1525 годзе ў Маскве быў асуджаны Максім Грэк, якому былі вядомы выданні Скарыны, і ў працах якога існуюць тэкстуальныя супадзенні з пражскімі кнігамі Царстваў, а таксама вялікая колькасць беларусізмаў

# Смерць

Найбольш верагодна, што Скарына памёр каля 1551 года ці ў студзені 1552 г. Аднак існуюць версіі, што Скарыны не было ў жывых ужо да 1541 года, гэтая дата найчасцей сустракалася ў савецкіх энцыклапедычных слоўніках. Захавалася «давераная грамата» караля Фердынанда I, выдадзеная 29 студзеня 1552 г. Кароль задаволіў гэтую просьбу і загадаў усім службовым асобам Чэшскага каралеўства дапамагаць Сімяону Скарыне ў такой справе. Сярод спадчыны асветніка названы кнігі ды іншыя паперы. У тым жа годзе аб'явілі аб сваіх прэтэнзіях Марцін Онкавіч і лаўнік віленскага магістрата купец Тоўсцік адносна.

У 2017 годзе даследчык Адам Мальдзіс выказаў здагадку, што Скарына мог быць пахаваны ў касцёле Святога Віта ў Чэскім-Крумлаве на поўдні Чэхіі.

Дзякуй за прагляд!